


Л.М. ХУХЛЫНДЗІНА, У.У. ВАСІЛЬКОЎ

# "DRANG NACH OSTEN" У КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКАЙ І СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ

Рассматриваются события мировой политики, предшествовавшие и сопутствующие военной агрессии нацистского режима в отношении Беларуси. Анализируются идеологические корни восточного вектора немецкой милитаристической экспансии; дается оценка роли Беларуси как объекта и субъекта дипломатии Европы, определяется значение белорусской карты в политике гитлеровского рейха.

The article considers the events in the world politics before and during military aggression of Nazi regime in the Soviet Union and in Belarus in particular. The author analyzes the ideological background of the Eastern direction of German military expansion, tries to show the role of Belarus both as subject and object of European diplomacy, exposes the meaning attached to Belarus in Nazi plans as a playing card in the politics of Third Reich.

"Drang nach Osten" у перакладзе з нямецкай азначае паход на Усход. Так са старажытных часоў, яшчэ ад Карла Вялікага, вызначалася народжаная ў раннім сярэднявеччы канцэпцыя знешняй палітыкі немцаў, пад якой разумеліся экспансійныя накірункі на Усход у форме ваеннай агрэсіі.

У 1108 г. Магдэбургскі епіскапат і свецкія ўладары Усходняй Саксоніі накіравалі маніфест святарству і свецкім уплывовым асобам у Вестфаліі, Надрэніі, Латарынгіі і Фландрыі, у якім заклікалі да крыжовага паходу супраць палабскіх славян. У маніфесце паміж іншага акцэнтавалася ўвага на тым, што зямля язычнікаў надзвычайна багатая мясам, мёдам, птушкамі і абяцае раздольныя ўраджаі глебы.

З гэтых пор час ад часу на прасторах Еўропы зноў чуўся грозны вокліч "Drang nach Osten!" і грукат нямецкай зброі; спачатку гэта былі мячы і дзіды, потым - гарматы, кулямёты і танкі. І калі полымя крыжацкага фанатызму згасне, знойдуцца новыя лозунгі, якія прывабяць сыноў Германіі змагацца на сваіх усходніх межах; а ў кнізе, якая на некаторы час заменіць немцам Біблію, шырокім масам дасціпна будзе даводзіцца неабходнасць новай усходняй каланізацыі. «Мы... спынім бясконцую міграцыю немцаў на поўдзень і захад і накіруем наш зрок на землі Усходу»[1].

Тэма войнаў нашага народа з магутным нямецкім ворагам, у тым ліку ў гады Вялікай Айчыннай вайны, асветлена ў многіх крыніцах: гістарычных дакументах, навуковых даследаваннях, публіцыстычных эсэ, мастацкіх творах, кінематографе. Параўнальна не так даўно скончаная, гэта вайна заставалася вельмі балючай і далікатнай ранай. Таму даследаванні на гэтую тэму пры ўсіх памкненнях да аб'ектыўнасці абмяжоўваліся пэўнымі даволі нягнуткімі рамкамі і табу, а погляды на тыя падзеі часам высвятляліся дыяметральна супрацьлеглымі. Гістарыяграфія савецкага часу вельмі часта змяшчала адзнакі гераічна-карыкатурнага, пафаснага стылю, якім добра пісаць п'есы і паэмы, але які не заўжды зручны для гістарычнага аналізу. У пазнейшыя ж часы, у 1990-я гг., наадварот, мелася тэндэнцыя перакуліць усё дагары нагамі і паднесці працэс нямецкай агрэсіі і акупацыі як страчаную магчымасць набыцця Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці. Наколькі падобныя сцвярджэнні маюць рацыю альбо не маюць яе? Якою бачылася нямецкім мілітарыстам роля вабіўшых іх усходніх зямель, у тым ліку і Беларусі? Якія ідэйна-псіхалагічныя чыннікі на працягу многіх гадоў натх-

нялі немцаў збірацца ў чарговыя паходы на Усход? Паспрабуем адказаць на пастаўленыя пытанні.

Імклівы ўсплеск нямецкай агрэсіі ва ўсходнім накірунку як выражэнне канцэпцыі паходу на Усход прыпадае на XIII-XV ст., калі з абшарамі нашай Бацькаўшчыны суседствавала моцна цэнтралізаванае і ўзброенае дзяржаўна-рэлігійнае ўтварэнне - Тэўтонскі рыцарскі ордэн. У выніку гераічнага адпору славянскіх вайсковых сіл у час бітвы пад Грунвальдам 1410 г. перспектыва нямецкай агрэсіі была эфектыўна адсунута ад Беларусі больш чым на 500 гадоў. У XVI ст. паступова адбываецца новая актывізацыя імперскай ідэі ў нямецкіх землях. Наступствы Трыццацігадовай вайны для немцаў былі нестаноўчыя. Абшары Германіі былі зруйнаваныя, немцы атрымалі дэпрэсіўны комплекс разрабаванага народа, што, як нам вядома, неаднойчы паўторыцца ў гісторыі. Адраджэнне сваёй моцы немцы будуць імкнуцца набыць ваенна-экстэнсіўным шляхам, што зноў-такі спародзіць агрэсіўны вектар "паходу на Усход".

Лагічным працягам экспансіяністкіх амбіцый нямецкіх імперый - Германскай і Аўстрыйскай - у XIX ст. стала фарміраванне цэнтральнаеўрапейскага ваенна-палітычнага блока, накіраванага супраць адпаведна ўсходне- і паўднёваславянскай дзяржаў: Расіі і Сербіі. Між тым не марна будзе нагадаць, што такі выдатны нямецкі дыпламат, як Бісмарк, лічыў вайну Германіі супраць Расіі вельмі небяспечнай для немцаў.

Калі з пачаткам Першай сусветнай вайны ўзброены немец упершыню амаль за 500 гадоў парушыў спакой нашай Айчыны, у нямецкага боку ўзнікпа неабходная патрэба ў распрацоўцы адпаведных навукова-палітычных дактрын адносна перспектыў найдалейшага прасоўвання ва ўсходнім накірунку. Немцы, натуральна, імкнуліся як мага больш эфектыўна выкарыстаць прынцып "падзяляй і ўладар" у адносінах да шматнацыянальнай расійскай манархіі. У Германіі ў 1915-1916 гг. з'явіўся шэраг прац, у якіх аўтары разглядалі разнастайныя канцэпцыі выкарыстання рэйхам (тады яшчэ Другім) вызваленчых імкненняў палякаў, летувісаў, латышоў, эстонцаў, фінаў, а далей і ўкраінцаў. Аднак зацікаўленасць беларускім пытаннем татальна адсутнічала. Нямецкі даследчык Э. Остман у 1915 г. акрэсліў беларусаў як "люд сялянскі і работніцкі, без годнай увагі інтэлігенцыі, наймацней сярод усіх народаў параднёны з расейцамі", у сувязі з чым не бачыў рэальных магчымасцей узнікнення сярод іх сепаратысцкіх памкненняў, якія можна было б выкарыстаць у справе нямецкай экспансіі[2]. Першапачаткова абшары Беларусі, Украіны і Латгаліі заставаліся па-за абсягамі германскіх тэрытарыяльных амбіцый. Летам 1915 г. фронт умацаваўся на лініі Дзвінск - Браслаў - Паставы - Смаргонь - Баранавічы - Пінск - Луцк аж да 1918 г. Толькі фактары катастрафічнага ўнутранага крызісу дагэтуль магутнай рускай дзяржавы і авантурнай знешняй палітыкі бальшавіцкага ўрада паскорылі заняцце немцам! абсалютнай большасці беларускіх зямель у выніку Брэст-Літоўскай дамовы.

У лістападзе 1918 г. стары вільгельмаўскі свет германскай ідэі быў знішчаны. Прайграная сусветная вайна здавалася немцам марнай ахвярай жыццямі блізкіх людзей, экзальтаваных ідэй і памкненняў і, урэшце рэшт, проста матэрыяльных сродкаў. Дыскрымінацыйнае становішча Германіі ў міжнародным супольніцтве, наяўнасць складаных сацыяльна-эканамічных праблем у час сусветнага крызісу капіталізму 1929-1933 гг., пры падкантрольнасці вялікіх аб'ёмаў капіталу і прамысловасці яўрэйскім кланам, плутакратыя, драпежніцкая канкурэнцыя, маральная дэпрэсія і разлад грамадства - усё гэта самым натуральным чынам паспрыяла выхаду на арэну гісторыі канцэпцый светапогляду, звязаных з настальгіяй па велічнаму мінуламу германскай нацыі - аж да яе язычніцкіх каранёў, калі Нямеччына сваім моцным целам захоўвала культуру Рымскай імперыі ад наплыву варвараў з Усходу, у тым ліку і славян. Новая рэлігія, грунтуючыся на ідэалагічных распрацоўках філосафа Ніцшэ, культуролага Шпенглера, а таксама шэрага акультных пісьменнікаў-містыкаў (Блавацкай, Ліста, Ланца і інш.), абвясціла лозунг абароны чысціні арыйскай расы ад дыструктыўнага на яе погляд уплыву юдэа-хрысціянскай культуры. Светапогляд, заснаваны на сутыкненні інтарэсаў немцаў і славян як дзвюх галін арыйскай расы - адпаведна паўнацэннай і сапсаванай, прывабіў народніцкія ("volkisch") гурткі Германіі, якія імкнуліся да шавіністычнай містыкі ў мэтах зберажэння чыстага германізму ад сацыял-дэмакратычных і яўрэйскіх палітычных сіл, персаніфікацыяй якіх з'яўлялася савецкая дзяржава, заснаваная на прынцыпах марксісцкай рэлігіі. Бальшавізм, як і ўвесь марксізм наогул, бачыўся натуральным увасабленнем юдэй-

екай ментальна-культурнай традыцыі. Сістэма Саветаў лічылася толькі загрымаванай формай таго ж самага кагалу - яўрэйскай абшчыны[3].

Шляхам дасягнення сваёй галоўнай мэты - адраджэння старажытнагерманскай нардычнай культуры - нацысты на чале з Гітлерам вызнавалі прынцыпы падпарадкавання прыроды і чалавечага розуму, метадам чаго былі акультныя пошукі, а ў палітычнай праекцыі - пошук "жыццёвай прасторы" для арыйскай нямецкай нацыі шляхам каланізацыі "дэградаваных" славяна-азіяцкіх абшараў. Ідэалагічны тэзіс аб расавай чысціні грунтаваўся на нацысцкай неаязычніцкай канцэпцыі захавання вернасці прыродзе. У адпаведнасці з поглядамі аднаго з заснавальнікаў расавай ідэалогіі нацызму Ё. Ланца, Першая сусветная вайна засведчыла аб "месіянскім здзяйсненні часоў". Нарастаючы расавы разлад і анархія, ваенны і культурны хаос павінны былі скончыцца новым азіяцкім нашэсцем на Заходнюю Еўропу. Таму місіяй нямецкай дзяржавы абвяшчалася абарона культуры Вялікай Еўропы ад уплыву азіяцкай Расіі. Ключавой постаццю ў распрацоўцы ідэалогіі новага паходу на Усход з'яўляўся Розенберг. У сваіх даследаваннях ён інтэрпрэтуе сусветную гісторыю як глабальны расавы канфлікт, маючы выліцца ў непазбежнае ахвярапрынашэнне нячыстай славяна-азіяцкай крыві дзеля ўзмацнення ўлады "чыстых арыйцаў".

Намаганні знешнепалітычных дзеячаў Германіі ў адносінах да Усходу з 1933 г. мелі тры ключавыя мэты: 1) трывалае ўцягванне ў сферу ўплыву Германіі дзяржаў Прыбалтыкі: Летувы, Латвіі і Эстоніі; 2) перамовы з Польшчай у мэтах выкарыстання яе тым ці іншым чынам супраць стратэгічных праціўнікаў Берліна - СССР і Чэхаславакіі; 3) любыя праекты, што маглі паслабіць уплыў Савецкага Саюза ў рэгіёне.

Дыпламатыя Трэцяга рэйха, маючы намер забяспечыць найдалейшую свабоду ў экспансіяніскіх дзеяннях, імкнулася выкарыстаць размеркаванне палітычных сіл тагачаснай Еўропы на сваю карысць. У перамовах з Брытаніяй Гітлер сцвярджаў, што англійскі прынцып раўнавагі немінуча састарэў і ўжо не можа адпавядаць брытанскім інтарэсам нават тэарэтычна. Прычынай таму была пагроза разгортвання вайсковай сілы на Усходзе і перспектыва бальшавізацыі кантынентальнай Еўропы, Англіі, а потым і ўсяго свету, што праявіцца ў сацыяльных пераваротах. Таму Гітлер быў упэўнены, што Англія будзе вітаць аднаўленне моцы Германіі і нават будзе мець у гэтым асаблівую зацікаўленасць. У 1933 г. Лондан і Парыж падпісваюць з Берлінам і Рымам "Пакт чатырох", выказваючы пажаданне вялікіх дзяржаў прытрымлівацца прынцыпаў еўрапейскай салідарнасці. У 1935 г. Лондан і Берлін заключаюць паміж сабой марскую дамову. У 1938 г. Лондан і Парыж падтрымліваюць на Мюнхенскай канферэнцыі тэрытарыяльныя патрабаванні Берліна ў адносінах да Чэхаславакіі.

Трэба зазначыць, што, на думку рэйхсміністра замежных спраў Германіі Рыбентропа, аптымальным варыянтам для нацысцкага Берліна было б выкарыстаць у сваёй глабальнай стратэгіі саюз трох таталітарных імперый - Германіі, СССР і Японіі - для далейшага падзелу сфер уплыву на агромністых еўразійска-афрыканскіх абшарах пераважна ў паўднёвым накірунку. Рыбентроп прыкладаў свой дыпламатычны імпэт на тое, каб дабіцца прыяднання Савецкага Саюза да пакта Рым - Берлін - Токіо. Але, нягледзячы на пазіцыю свайго міністра, Гітлер на працягу вясны 1941 г. займаў усё больш негатыўную пазіцыю да СССР. Ён быў перакананы ў тым, што Англія і Амерыка далучацца да жорсткай вайны супраць Германіі, як толькі дастаткова ўзброяцца. Ён баяўся, што гэтыя абедзве дзяржавы заключаць сувязь з Расіяй. Нямецкі фюрэр засцерагаўся таго, што Расія на аснове аднаўлення перамоў з Брытаніяй зможа напасці на яго адначасова з англа-амерыканскім наступам. Японія, хоць і лічылася да пачатку вайны хаўруснікам Германіі, але надзейнай апоры Берлін у ёй не меў. Японскія ўплывовыя колы імкнуліся выпусташыць Пакт трох дзяржаў і вышуквалі ўсялякія магчымасці, каб функцыянаванне альбо нефункцыянаванне гэтага пакта выкарыстаць як аб'ект гандлю са Злучанымі Штатамі. "За нашымі плячыма, - піша Рыбентроп, - у красавіку 1941 г. японскі міністр замежных спраў Мацуока падпісаў з Расіяй пакт аб ненападзе"[4]. Як паказала гісторыя, гэтая падзея стала выратавальным поспехам савецкай дыпламатыі. Вырашальным урэшце фактам для Гітлера з'явілася пазіцыя Амерыкі, якая пад націскам вельмі моцнага яўрэйскага лобі адышла ад ізаляцыяніскага стылю да простай і відавочнай варожасці фашыстам.

Калі ў пачатку сакавіка 1941 г. немцы ажыццявілі ўвод войскаў на тэрыторыю Балгарыі, Молатаў заявіў, што савецкі бок бачыць гэта «крокам, што выклікае жаль" і лічыць гэта парушэннем інтарэсаў бяпекі СССР[5]. У адказ савецкі ўрад 5 красавіка заключаў дамову аб сяброўстве з югаслаўскім урадам Сімовіча, варожым да Берліна. Нарэшце дзве сілы схіснуліся: у чэрвені распачалася бадай самая бязлітасная вайна сусветнай гісторыі. Па словах Гітлера, "гэта вайна - вайна светапоглядаў між юда-бальшавіцкім і нацыяналістычным светамі, і барацьба гэтая не можа быць выйграна дыпламатычнымі сродкамі"[6].

На пачатку 1941 г. у інструкцыі № 21, вядомай як план "Барбароса", былі зафіксаваны наступныя тэзісы: "Каб скончыць гэтую вайну, на такіх агромністых абшарах недастаткова будзе проста разбіць варожыя войскі. Уся тэрыторыя павінна будзе падзяліцца на дзяржавы з уласным кіраўніцтвам, з якім мы можам заключыць мір. Стварэнне такіх урадаў вымагае вялікага спрыту... Сённяшнюю Расію ўжо немагчыма ўявіць без сацыяльнай ідэі. Толькі яна можа стварыць унутраную аснову для ўзнікнення там новых дзяржаў і ўрадаў. Жыдоўска-бальшавіцкая інтэлігенцыя... мусіць быць знішчана... Нашаю мэтай з'яўляецца як мага хутчэйшае... стварэнне залежных ад нас сацыялістычных дзяржаўных арганізмаў. Задание настолькі складанае, што нельга абцяжарваць ім армію"[7]. Таму ў адпаведнасці з дадзенай дырэктывай планавалася накіраваць на азначаныя землі спецыяльных камісараў рэйха. Міністрам па справах акупаваных усходніх зямель быў прызначаны Розенберг. Паводле ягоных перакананняў, беларускі край быў занадта адсталым як у культурным, так і ў гаспадарчым сэнсе, і таму "абуджэнне яе нацыянальнага жыцця і стварэнне паўнакроўнага дзяржаўнага механізма" ў перспектыве выглядала вельмі маруднай справай. Беларусь ні ў якія дэталёва спраектаваныя тэрытарыяльныя структуры не ўваходзіла. Толькі ў траўні 1941 г. Розенберг прызнаў неабходнасць злучэння беларускіх зямель з балтыйскімі краінамі ў адзін рэйхскамісарыят Остланд. Што датычыцца планаў наконт насельніцтва нашага краю, то ў некаторых выказваннях нацысцкіх лідэраў Беларусь усплывала як зямля, прызначаная для рэзервацыі "непажаданых элементаў" з Прыбалтыкі і Польшчы. Нават была прапанова ператварыць беларускую тэрыторыю ў прыродны запаведнік, які наогул не мае патрэбы ў істотнай колькасці насельніцтва[8].

Увогуле, акупацыйны рэжым Трэцяга рэйха на тэрыторыі Беларусі, безумоўна, меў шмат агульнага з такімі ж рэжымамі ў іншых акупаваных гітлераўцамі еўрапейскіх краінах. Тым не менш сітуацыя на Беларусі выяўляла пэўную колькасць спецыфічных рыс і з'яўлялася для акупантаў у нейкім сэнсе праблематычным пытаннем. Па-першае, Беларусь была часткай вялікай дзяржавы - Савецкага Саюза, што была занята толькі часткова; а значыцца, проста немагчыма было цвёрда ажыццяўляць на беларускім абшары "права пераможцы", бо хоць беларускі народ у сваёй большасці і ўсведамляў уласную нацыянальную ідэнтычнасць, але гэта не перашкаджала яму мець трывалае адчуванне прыналежнасці да вялікай рускай гісторыі і культуры, носьбітам якіх, хоць і ў скажонай бальшавізмам форме, з'яўлялася савецкая дзяржава, якая працягвала ажыццяўляць узброенае супрацьстаянне.

Па-другое, Беларусь, у адрозненне, напрыклад, ад рэспублік Прыбалтыкі, не была да акупацыі самастойнай дзяржавай, не мела трывалых традыцый дзяржаўнасці і незалежнасці ў нядаўным мінулым, і тэты факт ускладняў спробы разыграць нацыяналістычную карту "вызвалення ад расійскага ярма", "абароны суверэнітэту" і г. д. 3 другога боку, тэты факт у значнай ступені быў акупантам на карысць: адсутнасць у беларусаў - як у своеасаблівага этнасу "тутэйшых" - яркавыразнай нацыянальнай ідэі прыводзіла да маральнай, палітычнай і грамадскай пасіўнасці народа, якім было б прасцей кіраваць, не баючыся агрэсіўнага рашучага адпору.

Па-трэцяе, існавала пэўная дыхатамія дзвюх частак Беларусі - усходняй і заходняй, што гістарычна было абумоўлена рознымі падзеямі напярэдадні вайны. Усяго за два гады да пачатку ваенных дзеяў тэрыторыя беларускай рэспублікі павялічылася ўдвая. На тэрыторыі Заходняй Беларусі па-ранейшаму значным заставаўся фактар барацьбы польскага падполля. Акрамя таго, абшары Беларусі былі падзелены на зоны з двума прынцыпова рознымі рэжымамі: вайсковым і цывільным, што абумовіла шэраг супярэчнасцей у поглядах наконт бела-

рускага пытання паміж неабмежаванай тыраніяй СС і адміністрацыяй гаўляйтэра Кубэ.

Даволі складаная сітуацыя панавала ў Заходняй Беларусі: пры далучэнні да БССР у канцы 1939 г. беларускае насельніцтва гэтага краю з радасцю сустрэла ліквідацыю польскага асадніцтва; але неўзабаве пачатак прымусовай калектывізацыі пакінуў негатыўны след у народнай памяці; да таго ж аўтарытэт савецкай улады падарвалі палітычныя рэпрэсіі і дэпартацыі. Таму першапачаткова заходнебеларускае сялянства паспрабавала выкарыстаць прыход немцаў для роспуску ўсіх калгасаў і вяртання на індывідуальную гаспадарку. Аднак фашысцкі рэжым прытрымліваўся палітыкі захавання калгасаў, таму ў аграрным плане прывабіць таксама не мог. Немцы зусім не спяшаліся з вызначэннем будучага грамадскапалітычнага ладу, толькі прыкрываліся лозунгамі аб вызваленні ад бальшавізму. Частку беларусаў - найбольш супрацоўнікаў савецкай адміністрацыі і інтэлігенцыі - ахапіла паніка. Яны баяліся пометы з боку палякаў за сваю дзейнасць у 1939-1940 гг. Пры такіх настроях у Заходняй Беларусі панавала няпэўнасць І пасіўнасць. Прызначаючы на першых этапах палякаў на шэраг пасад у апаратах мясцовага кіравання ў "крэсах всходніх", немцы імкнуліся разыграць карту польскага гонару і ў нейкай ступені ўлагодніць польскі нацыяналізм.

Акрамя адміністрацыйна-палітычнай цэнтралізацыі ўлады, акупанты ўкаранялі і праграмы ідэалагічнай апрацоўкі беларусаў. Для гэтага выкарыстоўваўся, напрыклад, беларускі нацыянал-сацыялістычны рух Акінчыца. Асноўным прынцыпам праграмы яго гэтак званага Руху маладых актывістаў была выснова, паводле якой пабудова самастойнай беларускай дзяржавы ў бліжэйшым часе была немагчыма з-за адсутнасці спрыяльных умоў. Абуджэнне, на іх думку, магло надысці толькі ў аддаленай будучыні. Таму "папяровыя генералы - прафесары і дактары" не могуць быць рэальнымі прадстаўнікамі Беларусі, і сапраўднае беларускае адраджэнне трэба пачынаць знізу пад германскім кіраўніцтвам. Такім чынам, прадстаўнікі падобных рухаў лілі ваду на млын гітлераўскай прапаганды, якая суцэльна адмаўляла беларускай нацыі ў праве мець уласную інтэлігенцыю.

Звязаны з міністэрствам Розенберга штомесячнік "Deutsche Post aus dem Osten" сцвярджаў: "Увогуле, будучнасць беларускай, або крывіцкай, нацыянальнасці пакуль стаіць пад пытальнікам, а на думку скептыкаў, знаходзіцца цалкам пад сумненнем". Населенае прадстаўнікамі розных этнасаў і канфесій, тое скрыжаванне культур і ўплываў, якім з'яўлялася Беларусь, уяўлялася нямецкім уладам "не больш, як імглістае геаграфічнае паняцце"[9]. У пазнейшым часе план "Ост" прадугледжваў высяленне 75 % прадстаўнікоў нашай нацыі за межы ўласнай тэрыторыі. Астатнія 25 адсоткаў планавалася анямечыць. Меўся таксама і іншы варыянт: з дапамогай беларусаў каланізаваць землі з найменш прыдатнай зямлёй на Урале і Паўночным Каўказе. Лёс нашай Бацькаўшчыны выглядаў, мякка кажучы, даволі незайздросным. Але эсэсаўскім тэорыям не дадзена было матэрыялізавацца.

Паступовая агонія фашысцкай ваеннай кампаніі выклікала спробы акупацыйнага рэжыму на зямлі нашай Айчыны ўхапіцца хоць за якую-небудзь дапаможную нітку. Нарэшце, такой ніткай з'явіўся беларускі нацыяналістычны рух, які дагэтуль пагарджаўся немцамі. Раней акупацыйныя кіраўнікі не дапускалі і думку стварэння якога-ніякога беларускага ўрада. Але пасля таго, як на франтах пачаўся контрнаступ, адміністрацыя генеральнай акругі звярнулася да колаў беларускай інтэлігенцыі з праектам склікання Беларускай Цэнтральнай Рады (БЦР) як прадстаўнічага органа беларускай нацыі. Характэрна, што ў самым пачатку пачалася рознагалосіца паміж БЦР і нямецкімі штабнымі ўладамі. Немцы былі ўпэўнены, што функцыі Рады вычэрпваліся толькі правядзеннем мабілізацыі, а кіраванне належыць да іх саміх. Урэшце, уся аперацыйная справа войска была аддадзена штабу Готберга.

З цягам часу станавіўся ўсё большай рэальнасцю правал кампаніі паходу Гітлера на Усход. Да самага канца лідэр Трэцяга рэйха быў перакананы ў тым, што трагедыя той кампаніі, якую ён праводзіў, аказалася ў тым, што ў сутыкненні дзвюх цывілізацый - усходняй і заходняй - Захад ударыў нажом у спіну таму народу, які вёў бітву "дзеля Еўропы і ўсяго культурнага свету".

Бясспрэчным фактарам перамогі над ворагам бачыцца тое нечаканае ўзрушэнне патрыятычнай волі, якую праявілі нашыя народы - спадкаемцы унікальнай тысячагадовай культуры вялікай і непераможнай Русі, людзі мірнага шляху хрысціянскага гуманізму, цярплівыя і гасцінныя жыхары сярэдзіны Еўропы. У сусветнай катастрофе, што адбывалася на працягу 1941-1945 гг., ішла барацьба і за адвечныя каштоўнасці ўсходнеславянскай культуры, што мела спадчынай мудрасць Візантыі і калісьці зберагла Еўропу ад мангольскай экспансіі. Дзівосны суд гісторыі наканаваў бітве адной таталітарнай сістэмы супраць другой адстаяць прынцыпы чалавечнасці, прынцыпы маралі, веры ў дабрыню і зло - усё тое, што належыць той самай юдэа-хрысціянскай культурнай традыцыі', супраць якой накіравала ўсю сваю варожасць неаязічніцтва Трэцяга рэйха.

Ці маглі б тыя фатальныя падзеі мець іншае развіццё? Ці можна, напрыклад, мець размову пра варыянт стварэння нацысцка-савецкага альянсу? Разгледжаныя факты сцвярджаюць, што, хутчэй за ўсё, - не. Бо варожасць да рускіх была закладзена ў гітлераўскім рэжыме, у самых глыбокіх ідэалагічных і псіхалагічных каранях. А вось магчымасць знішчэння савецкай дзяржавы была поўнасцю рэальнай. Таму гістарычная правідэнцыя абрала для нашай краіны самы лепшы варыянт. Але гэты варыянт быў набыты рэкамі святой крыві продкаў. І яшчэ тым, што за святочны стол з намі ўжо ніколі не сядзе кожны чацвёрты (бадай, трэці) госць.

1 Гитлер А. Моя борьба // http://lib.ru/POLITOLOG/AE/putx.txt
2 Гл.: Туронак Ю.Б. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн., 1993. С. 12.
3 Гл.: Форд Г. Международное еврейство. М., 1994. С. 150.

4

5 Гл.: Там жа. С. 247.
6 Там жа. С. 277.
7 Цыт. па: Warlimont W. Im Hauptquartier der deutschen Wehrmacht 1939-1945. Frankfurt, 1962. P. 45.
8 Гл.: Туронак Ю. Б. Указ. сач. С. 39.
9 Там жа. С. 74.

Ластупіў у рэдакцыю 06.05.05.

***Людміла Міхайлаўна Хухлындзіна*** - кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры міжнародных адносін.
***Уладзімір Уладзіміравіч Васількоў*** - студэнт 4-га курса факультэта міжнародных адносін.

*І.А. ЛІТВІНОЎСКІ*

## ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

Освещены боевые действия Красной Армии и партизан по изгнанию немецко-фашистских захватчиков с территории Беларуси осенью 1943 и летом 1944 года. Проанализированы первые мероприятия по восстановлению народного хозяйства республики.

The article describes the operations of the Red Army and partisans in banishing fascist aggressors from the territory of Belarus in autumn 1943 and in summer of 1944. The first actions on restoration of the national economy are shown.

Яркай старонкай гісторыі Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа з'явілася вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкага рабства. Беларускі народ узняўся на свяшчэнную барацьбу супраць акупантаў і тры доўгія гады самааддана змагаўся за сваю свабоду. На акупіраванай тэрыторыі нямецка-фашысцкія захопнікі сустрэлі арганізаваны адпор ужо ў першыя месяцы вайны. У дакуменце стаўкі вярхоўнага камандавання гітлераўскага вермахта, датаваным 16 верасня 1941 г., гаварылася: «З самага пачатку ваеннай кампаніі супраць Савецкай Расіі ва ўсіх акупіраваных Германіяй абласцях узнікаў камуністычны паўстанцкі рух. Гэты рух носіць розны характар, пачынаючы з прапагандысцкіх выступленняў і замахаў на асобных ваеннаслужачых нямецкай арміі і канчаючы адкрытымі мяцяжамі і арганізаванай партызанскай вайной»[1]. (Тут и далей пераклад аўтара. - ***І. Л.)***

Арганізатарам барацьбы беларускага народа з'явілася Камуністычная партыя Беларусі. Беларускія камуністы правялі на акупіраванай тэрыторыі велізарную па сваіх маштабах і значэнню арганізацыйна-палітычную работу, у выніку